# ПОРІВНЯЛЬНЕ ЛІТЕРАТУРОЗНАВСТВО

**Ж.С. Шаладонава**, к.філол.наук, (Мінск)

## Паэзія Якуба Коласа і Максіма Рыльскага ў святле ландшафтнай паэтыкі

*В статье акцентируется выразительная пространственная доминанта образно-поэтического мышления Якуба Коласа и Максима Рыльского. Анализ ключевых топосов (в частности, леса) характеризует их важную функцию в формировании национальной картины мира, в эстетической, этнокультурной презентации природных ландшафтов Беларуси и Украины.*

*Ключевые слова: ландшафт, пространство, топос, менталитет, символ, национальная картина мира.*

*Zh. S. Shaladonava Yacub Kolas, Maxim Rylsky and landscape poetics*

*Significant spatial dominant of figurative poetic thinking of Yakub Kolas and Maksim Rylsky emphasizes in the article. Analysis of the key toposes (forests, in particular) characterizes their important function in the creating of the national scene of the world and in aesthetic ethno-cultural presentation of natural landscapes of Belarus and Ukraine.*

*Key words: landscape, space, topos, symbol, mentality, national scene of the world.*

Якуба Коласа і Максіма Рыльскага звязвалі добрыя і шчырыя сяброўскія адносіны. Многае «вядома пра непасрэдныя кантакты песняроў, іх сустэчы падчас пісьменніцкіх форумаў, юбілейных урачыстасцей у Маскве, Мінску, Кіеве. З увагай і цікавасцю ставіліся мастакі слова да творчасці адзін аднаго. У 1951 г. Якуб Колас пераклаў верш М.Рыльскага "Музей Леніна ў Пароніне" (ЛіМ, 6 студз.). Максім Рыльскі, які шмат перакладаў з розных моў, у тым ліку з беларускай (Ф.Багушэвіч, Я.Купала, К.Крапіва, П.Броўка, А.Куляшоў, М.Танк і інш) перастварыў наступныя вершы Якуба Коласа: "На раздарожжы", "Ідзі", "Янку Купале", "Лясам Беларусі" (з паэмы "Суд у лесе"), "Выглядаеш ты яснай вясной", "Ворагам".

Цёплыя і прачулыя паэтычныя радкі прысвяцілі паэты адзін аднаму. У 1952 г. да 70-гадовага юбілею Якуба Коласа Максімам Рыльскім быў напісаны верш “Якубу Коласу”. У вершы аўтарам тонка заўважана генетычная сувязь таленту і творчасці беларускага песняра з беларускім геаграфічным ландшафтам, што паўплываў на індывідуальна-аўтарскае светаадчуванне і эксплікаваў сябе праз адпаведную паэтычную вобразнасць: “Ад сэрца дзякуй добрай той зямлі, / Што спавіла Вас, песні навучала!” (пераклад К. Кірэенкі).

Ідэя ўніверсальнай узаемасувязі чалавека і наваколля зыходзіць да хрысціянскай легенды аб стварэнні свету, калі зямны, матэрыяльны, цялесны пачатак быў адухоўлены ўзвышана-нябесным. Знешні, фізічны свет і ўнутрана-духоўны існуюць у такім, на першы погляд, супярэчлівым дыялектычным адзінстве, узаемаабумоўленасці і ўзаемадапаўняльнасці. Праз спецыфіку топасаў, якія фарміруюць мастацкую прастору твораў, жывапісная і маляўнічая пластыка апісанняў паўстае як паказчык ідэйна-эстэтычных густаў і выяўленчага майстэрства аўтара і ключавы момант яго нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. У 1955 г. да 60-годдзя ўкраінскага паэта Якуб Колас напісаў верш “Песняру Максіму Рыльскаму”. Цікава і арыгінальна беларускі класік канвертуе паэзію юбіляра таксама ў прасторава прыметны вобраз саду:

Паэт-летапісец, мой дружа Максіме,
Цудоўнай паэзіі сад,
Што ўзносіць высока паэтава імя
І цветам духмяным багат! [2, т. 4, с. 89]

У артыкуле “Пра паэта і сябра” (1957), напісаным М.Рыльскім пасля смерці Якуба Коласа, украінскі пясняр узгадвае: “Я не так шмат разоў сустракаўся з Якубам Коласам, але кожная сустрэча з ім пакідала ў памяці водар чыстай ляснай кветкі, знойдзенай ранняй вясной на паляне… Уражанне чысціні і свежасці” [6, т. 9, с. 388]. У гэтым яркім вобразным параўнанні украінскі паэт улавіў і перадаў адметную прасторавую архітэктоніку твораў Якуба Коласа, ландшафтную ўкаранёнасць яго мыслення, як таксама і тое, што творчасць класіка беларускай літаратуры – “ад роднае зямлі, ад гоману бароў”– сканцэнтравала ў сабе адмысловы пах, водар і дух беларускай нацыянальнай стыхіі. Акадэмік І. Навуменка зазначыў: “Не прыходзіцца спрачацца, што

паэтызацыя прыроды ў Коласа не ідзе ні ў якое параўнанне з пейзажнымі малюнкамі яго папярэднікаў. Коласаўскі жывапіс словам узняўся на якасна новую вышыню параўнання з лепшымі ўзорамі пейзажнай лірыкі ў рускай і польскай літаратурах. Вядома, з агаворкай, што жывапіс гэты тыпова беларускі" [4, с. 52 – 53].

Мастак заўсёды ўспрымаецца як працяг, прадаўжэнне рэальнасці, якая ім эстэтычна перажываецца і ўзнаўляецца. Пах, водар, подых, дух творчасці і духоўнасць асобы – усё гэта прадугледжвае і абумоўлівае наяўнасць паветра, глебы, поля ці стэпу, леса або саду, – асноўных прасторавых канстант нацыянальнай карціны свету. Такім чынам, воблік беларускага песняра атаясамліваецца М. Рыльскім з гаючай сілай нацыянальных – лясных – краявідаў. Максім Багдановіч як тыповую асаблівасць беларускага ландшафта вылучаў якраз тое, што: "край беларускі лясісты і балоцісты... Украінская стыхія – стэп, у нас наша стыхія – лес і балота. Тут ёсць свая адметная краса, адметная рытміка, адменны чар. Трэба іх падгледзець, знайсці і вынесці на шырокі свет" [3, с. 195].

Прыродныя ландшафты кожнай краіны фарміруюць яе ўнікальны геабіякліматычны партрэт, на працягу стагоддзяў уздзейнічаюць на лад жыцця, менталітэт насельніцтва. "Культура заўсёды – спалучанасць чалавека і ландшафту; яе цяжка ўявіць асобна ад ландшафту.... Бачанне культуры мае на ўвазе ландшафт – бачанне ландшафту мае на ўвазе культуру... Звярнуўшыся да ландшафту, можна шмат даведацца пра культуру. Ландшафт – яе нечаканая сфера, сведчанне, адваротны бок" [1, с. 134–135]. Ландшафт увасабляе жыццёва-практычныя і эстэтычныя арыенціры культуры, у тым ліку і мастацтва слова, спалучае сімволіку прыроды і сацыяльных адносін у адзіны комплекс значэнняў, тоесных сутнаснаму абліччу чалавека.

У паэзіі Якуба Коласа і Максіма Рыльскага канкрэтыка жыцця і яго візуальная нагляднасць выступаюць маляўнічымі адбіткамі навакольнага свету, метафарычнымі сродкамі перадачы глыбокіх унутраных перажыванняў аўтараў і лірычных герояў, адцяняюць свет іх пачуццяў, эмацыянальны стан, раскрываюць духоўнае багацце, жыццёвыя прыярытэты, філасофскія роздумы над вузлавымі момантамі існавання. Каларытныя і яскравыя пейзажныя замалёўкі нацыянальных ландшафтаў фіксуюць

непасрэдныя аўтарскія эмацыянальна-пачуццёвыя ўражанні ад навакольнага свету, напаўняюцца ў творах сэнсавай шматзначнасцю, адмысловай сімволікай, духоўнасцю. У выніку ўтвараецца мноства сэнсавых канатацый, праз якія адбываецца перадача не толькі візуальна-нагляднай інфармацыі, але, найперш, культурна-ментальнай “Не ў аднэй толькі нашай душы / Зерне ёсць хараства –/ Аб ім казку складае ў цішы / Колас нівы, трава. / Не ў адным толькі сэрцы людзей / Іскра праўды гарыць – / Аб ёй песню пяе салавей, / Аб ёй рэчка журчыць” [2, т. 7, с. 6].

Прасторавая накіраванасць думкі, глыбіня пранікнення ў рэаліі паўсядзённасці, зліццё з імі характарызуюць асаблівасці светаразумення і светаўспрымання Якуба Коласа і Максіма Рыльскага. З гэтай эстэтычнай пазіцыі вынікае тыпалагічнае адзінства мастакоў у асэнсаванні быццйнай сутнасці нацыянальнай стыхіі, прасвятленні, удакладненні, канкрэтызацыі яе вобразаў у каларытным жывапісе і выяўленчай пластыцы твораў. Скаардынаванасць мыслення са светавым прыродным жыццём надае чалавеку паўнату, самадастатковасць, далучае да касмічных працэсаў адвечнага руху, адраджэння, выступае ўмовай бессмяротнасці: “Згадай, безумче! Світ — не тільки ти: / Крім тебе є думки, планети, птиці. / Є з'явища такої красоти, / Яка тобі, дурному, і не сниться! / Вмираючи, умій зо співчуттям, / З усмішкою поглянути навколо... / Хто злився раз із світовим життям, – / Згниє в землі, але не вмре ніколи!” [5, с. 110].

Такая прыродна-натуральная оптыка душы і адпаведны склад мыслення мастакоў, відавочна, сфарміраваліся з самага дзяцінства. У Якуба Коласа яно прайшло ў маляўнічых мясцінах Ластка, Альбуці, занатаваных у радках паэмы “Новая зямля”: “Вось як цяпер перада мною Ўстае куточак той прыгожа, Крынічкі вузенькае ложа І елка ў пары з хваіною”. Дзіцячыя гады Максіма Рыльскага, які нарадзіўся ў Кіеве, таксама звязаны з улоннем прыроды. Хлопчык рос ў сяле Раманаўка Сквірскага павету Кіеўскай губерніі (цяпер Жытомірская вобласць), на радзіме маці Меланіі Фёдараўны. Любоў і замілаванасць гармоніяй і прыгажосцю натуральна-прыроднага свету пісьменнікі пранеслі праз усё жыццё. Якуб Колас быў заўзятым грыбнікам, Максім Рыльскі – рыбаком і паляўнічым, які не забіў ніводнай птушкі і звера.

Сілу ўздзеяння прыроднага асяроддзя Рыльскі акцэнтаваў у вышэй узгаданым артыкуле, калі, параўноўваючы творчасць Якуба Коласа і Адама Міцкевіча, звярнуў увагу на іх агульныя геаграфічныя і этнакультурныя каардынаты: "творчасць іх вырасла на адной глебе, тыя самыя крыніцы паілі іх, тыя самыя даліны і пагоркі цешылі іх вочы, той самы шум адвечнага бору навяваў ім шчырыя, простыя, глыбокія словы".

Максіму Рыльскаму была блізкая і зразумелая форма прасторавай зарыентаванасці мыслення, яго пачуццёвай інтэнсіўнасці ў асэнсаванні з'яў навакольнага свету. Даследчыкі творчасці ўкраінскага паэта асновай яго мастацкага светапогляду лічаць гамсунаўскі пантэізм, зліццё з прыродай. У жывапіснай і маляўнічай паэзіі М. Рыльскага выяўлена надзвычай багатая палітра каларытных і запамінальных вобразаў-топасаў нацыянальнай прасторы, што пазначаны шчыльным паэтыка-сімвалічным, філасофскім арэолам, духоўна-эмацыянальнай і ментальна-псіхалагічнай насычанасцю. Сярод іх прыкметнае месца належыць вобразу лесу, які, праўда, ва ўкраінскай нацыянальнай карціне свету не займае таго дамінантнага значэння, як ў беларускай. У Максіма Рыльскага, як і ў Якуба Коласа гэта адзін з улюбёных паэтычных вобразаў, хранатоп важнейшых гістарычных і біяграфічных падзей, транслятар своеасаблівай жыццёвай філасофіі.

"Самы любімы герой Коласа, без перабольшвання, – лес. Ён у Коласа найбольш каштоўнае пароджэнне маці-зямлі, скрыжалі самога жыцця, кніга, поўная таямніц" [7, с. 160]. Адчуваючы моцную повязь, нават параднёнасць з гэтай прыроднай стыхіяй, песняр успрымае яе як неад'емную частку, саўдзельніцу свайго жыцця і жыцця цэлага народа. Таму лес набывае важную функцыянальную нагрузку, выступаючы не маляўнічым дэкорам, а паўнапраўным героем твораў, непасрэдным удзельнікам жыццёвых падзей.

Каларытна і маляўніча выпісаныя лясныя ландшафты ў паэзіі Якуба Коласа тонка адцяняюць аўтарскую душэўнасць і пачуццёвасць, адчуванне паўнаты, прыгажосці і гармоніі жыцця, кантэкстуальна афармляюць лірыка-філасофскія роздумы, успаміны, сардэчна-эмацыянальную настальгічную спавядальнасць: "Каля пасады лесніковай / Цягнуўся гожаю

падковай / Стары, высокі лес цяністы. / Тут верх асіны круглалітсты / Сплятаўся з хвоямі, з дубамі, / А елкі хмурымі крыжамі / Высока ў небе выдзяляліcь, / Таемна з хвоямі шапталіcь. // Лес наступаў і расступаўся, / Лужком зялёным разрываўся; / А дзе прыгожыя загібы / Так міла йшлі каля сядзібы, / Што проста імі б любаваўся" [2, т.8, с.7]

У паэме "Суд у лесе", падрабязна і дэталёва апісваючы лясныя ландшафты, Якуб Колас дэманструе непераўзыдзенае майстэрства пейзажнага жывапісу, разгорнута і маляўніча выяўляючы пры гэтым не толькі асаблівасці нацыянальна-этнічнай прасторы, але і ўласны псіхалагічны стан, настрой і перажыванні. Узнікае адчуванне, што мастацкае заглыбленне ў лясныя шаты садзейнічае самазаглыбленню аўтара ў нетры сваёй душы, і пейзажныя замалёўкі карэлююць з філасофскі разважлівым і эмацыянальна пранікнёным маналогам-споведдзю: "Люблю я лес, адвечны бор, / Дзе ўзносяць хвоі ўгору шапкі, / Дзе рассцілаюць елі лапкі / І востры верх мкнуць у прастор. / Заўсёды ў лесе добра мне: / У ім так ціха, урачыста, / Калі прытоіцца ўсё чыста, / І ветрык нават не дыхне. // І дуб крапак і куст малы / Стаяць у мудрым задуменні, / А сосны сочаць і струменяць / Густы, духмяны пах смалы". [2, т. 10, с. 254]

У паэтычных апісаннях лесу М. Рыльскі таксама апелюе да філасофскіх роздумаў, змястоўна-знакавай сімволікі. Вобразы дрэў успрымаюцца і асэнсоўваюцца "не толькі як сімвал космасу, але і як спосаб выяўлення жыцця, маладосці, бессмяротнасці, мудрасці і ведання" [8, с. 324]. У вершы "Зялёная пена лесу маладога" мастаком перададзена цесная сувязь канкрэтнага і шматаблічнага расліннага свету і суб'ектыўна-чалавечага, філасофскага, міфалагічнага. Урачыстая веліч, мудрасць і стыхійная разняволенасць натуральна прыроднага пачатку, увасобленага ў вобразах "зялёнай пены лесу", "мудрых пчол", "задуменных і строгіх дубоў", схіляе да аналітыкі, роздумнасці над ключавымі момантамі існавання, адкрыцця спрадвечных ісцін: "Зелена піна лісу молодого / Дрімотно плеще, як на морі шум. / Блакитні тіні впали на дорогу, / Заворожили мудрі бджоли ум. // Стоять дуби замислено і строго. / Тут – перейшовши молодий самум – / Собі поставлю келію убогу, / Щільник пахучий для останніх дум. / Ліловий чебрик сохне на поляні. / Неначе привід, пробігає цап, / І

чути дятла стуки дерев'яні. // Душі здається, що вона могла б / Вас відтворити і ясному свічаді, / Дитячі дні, заплакані і раді" [5, т. 1, с. 174]

Лясныя ландшафты заўсёды маркіруюцца аўтарскімі ўспамінамі і перажываннямі: праз сезонна абумоўленыя, зрокава наглядныя асаблівасці вегетацыйнага цыклу характарызуецца ўнутраны эмацыянальна-настраёвы стан лірычнага героя, акрэсліваюцца вехі чалавечага жыцця (маладосць, сталасць), гарманічнае спалучэнне ў ім неўтаймаванай пульсуючай энергетыкі і глыбакадумнай засяроджанасці і таямнічасці. У "жыццёвым лесе" "Срэбнага санета" менавіта псіхалагічныя адчуванні і душэўныя перажыванні героя ажыўляюць малюнак, надаючы яму своеасаблівы пульсуючы рытм, паглыбляюць адчуванне часу і вечнасці: "Посріблені ліси окуталися тінню, / А небосхил горить і віти золотить. / Виходжу я на шлях – на смугу ясно синю, – / І чудно й дзвінко сніг під валянком скрипить. // У цьому ж лісі я пив самоту осінню, / Тут весну цілував під шелест верховіть, / Тут літом пропливли ледачі дні незмінні, – // Тепер сюди прийшов мороза я зустріть. / Цей вечір, замкнений в холодному спокої, / Ясний, докінчений нагадує сонет, / Сонет краси гаїв і тиші зимової. // Зі сніжних рим дзвінких його зложив поет, / Чий силует на тлі блакиті неземної / Для тих, хто молиться, є божий силует" [5, с. 138].

У творах мастацкай літаратуры ландшафты трансфармуюцца ў крэатыўную стыхію, якая валодае невычэрпнымі выяўленчымі магчымасцямі ў перадачы аксіялагічнай, духоўна-філасофскай змястоўнасці і псіхалагічнай насычанасці быцця. Ландшафтныя асаблівасці абумоўліваюць мэтазгоднасць выбару народам пэўных жыццёвых прыярытэтаў і арыенціраў, функцыянальнасць яго бытавых і культурных звычаяў, спецыфіку нацыянальнага мыслення. Тып прасторы ў многім выяўляе сутнасць нацыянальнага жыцця, а ў мастацкім творы выступае яго разгорнутай і ёмістай метафарай. І, наадварот, жыццёвы свет адбіваецца ў навакольным прыродным ландшафце, які ператвараецца ў вынік сацыякультурнага вопыту і крэатыўных здольнасцей насельнікаў.

У паэзіі Я. Коласа і М. Рыльскага прасторава-прыродныя топасы – у прыватнасці, топас лесу – у сваёй метафарычнай

насычанасці выступаюць своеасаблівым кодам дыялектычнага пазнання нацыянальнага космасу Беларусі і Украіны, садзейнічаюць больш глыбокаму, каларытна аздобленаму выяўленню ўнутранага душэўна-псіхалагічнага стану аўтара і лірычнага героя. Погляд Якуба Коласа на прыродныя рэаліі панарамны, па-філасофску разважлівы і засяроджаны ў асэнсаванні і спасціжэнні кожнай з'явы народна-нацыянальнага жыцця, якая ўспрымаецца як своеасаблівы ключ да яго гісторыі, мудрасці і таямнічасці. Максіма Рыльскага хвалюе ўнутрана-інтымны свет лірычнага героя, жыццё яго сэрца ў дадзены момант з праекцыяй на агульначалавечыя каштоўнасці, што па-майстэрску раскрываецца ім праз насычаную колерамі і пахамі вобразную каларыстыку паўсядзённасці. Вытокі такіх адмысловых эстэтычных пазіцый мастакоў бачацца ў індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцях іх таленту і светапогляду, а таксама генетычна ўкаранёныя ў народнае светаўспрыманне, беларускі і ўкраінскі менталітэт з уласцівымі ім антрапамарфізмам, анталагічным паяднаннем суб'екта і аб'екта.

Літаратура: Каганский, В.Л. Ландшафт и культура / В.Л. Каганский // Общественные науки и современность. – 1997. – № 1.; 2. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. / Я. Колас. – Мінск: Беларус. навука, 2007 – 2012.; 3. Ластоўскі, В. Мае ўспаміны аб Багдановічу // Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 1997.; 4. Навуменка, І. Якуб Колас. Духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1981.; 5. Рильский, М. Зібрання творів в дваццяти томах / М. Рильский. – Т. 1. – К., 1983.; 6. Рильский, М. Твори. В десяти томах / М. Рильский. – Т.9: Статті про літературу, мистецтво й народну творчість. – К: Вид. худож. литератури, 1962.; Шамякіна, Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія / Т.І.Шамякіна. – Мінск: БДУ, 2001.; Элиаде, М. Избранные сочинения: Миф о вечном возвращении. Образы и символы. Священное и мирское / М. Элиаде. / М.: Ладомир, 2000.

Рецензенти: Ткачук М.П., д-р філол.наук, проф. (Тернопіль)
Данилевич М.М., к. філол. наук, доц. (Тернопіль)